**Зарплата “ў канверце”**

Большасць наймальнікаў плаціць падаткі, і плаціць сумленна, але выпадкі, калі працадаўца выплачвае сваім работнікам зарплату “ў канверце”, працягвае існаваць.

Угаворваючы работніка на выплату зарплаты “ў канверце”, наймальнік у якасці аргумента прыводзіць, што без выплаты падаткаў сума заработнай платы будзе большая, чым афіцыйная. Пры гэтым працадаўца не агаворвае, што сам работнік пазбаўляецца многіх правоў і сацыяльных гарантый, прадугледжаных заканадаўствам. Рана ці позна фізічныя асобы, якія атрымліваюць заработную плату “ў канверце”, сутыкаюцца з наступствамі незаконнай формы аплаты працы.

Так у работніка, які атрымлівае так званую “шэрую” зарплату, адсутнічаюць афіцыйныя звесткі аб фактычна атрыманай заработнай плаце, што ставіць пад пытанне, напрыклад, атрыманне крэдыту на будаўніцтва, куплю кватэры і г.д., у выпадку хваробы выплата па бальнічным лісту будзе праведзена толькі з разліку легальнай заработнай платы. Ёсць і больш доўгатэрміновыя наступствы, пры такім варыянце заробку, адсутнічаюць гарантыі на належную па законе пенсію. Больш за тое, існуе рызыка не атрымаць такі заробак увогуле.

Не лішнім будзе нагадаць нядобрасумленным працадаўцам, што за парушэнне заканадаўства ў частцы выплаты заработнай платы без выплаты абавязковых страхавых узносаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва прадугледжаны адміністрацыйная і крымінальная адказнасць.